# СТУПЕНЬ РЫЗЫКІ

Надтачэеў Георгій Мяфодзьевіч нарадзіўся ў 1916 годзе ў вёсцы Красніца Быхаўскага раёна. Скончыў сямігодку. Вучыўся ў аэраклубе Асаавіяхіма. У 1938 годзе быў прызван у Чырвоную Армію, дзе скончыў лётную школу.

У Вялікай Айчыннай вайне ўдзельнічаў у якасці лётчыка сувязнога самалёта, лётчыка начных бамбардзіроўшчыкаў і лётчыка-штурмавіка.

Званне Героя Савецкага Саюза малодшаму лейтэнанту Г. М. Надтачэеву прысвоена Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 13 красавіка 1944 года.

Абхапіўшы калені рукамі сядзеў у горкім роздуме пад крылом толькі што атрыманага У-2. Сувязны самалёт. Паваюеш на ім! паветраны рамізнік, паштальён... І трэба ж было рвацца на фронт з-за гэтага "кукурузніка"!

Георгій схамянуўся. Ускочыў на ногі. Агледзеўся. Паблізу нікога не было. Няўжо гэта ён сам услых сказаў такое грубае слова пра самалёт, на якім упершыню пазнаў радасць палёту над зямлёй? Яму стала сорамна, як перад жывой, незаслужана пакрыўджанай істотай. Ён абышоў самалёт вакол, ласкава пагладжваючы фанерна-дэрмацінавую абшыўку. Успомніў размову з камандзірам авіябамбардзіровачнага палка.

– даверыць вам машыну, якую дрэнна ведаеце, мы не можам, – гледзячы навічку ў вочы, гаварыў падпалкоўнік.

– Гэта таксама рызыка і рызыка несапраўдная. – Падпалкоўнік памаўчаў, аб нечым думаючы. Яму падабалася настойлівасць лётчыка. Але ж зараз трэба ваяваць, а не стажыравацца. – Атрымлівайце А-2, і справа з канцом.не думайце, што на сувязным самалёце будзеце жыць бесклапотна. Потым, пры выпадку, пашлём на перападрыхтоўку.

...Сувязны У-2 павольна плыў над лясамі, знявечанымі артылерыйскім агнём, над палямі, зрытымі акопамі і траншэямі. Уздоўж дарогі валяліся абпаленыя каркасы аўтамашын, павозак. Паказалася паўразбураная бамбёжкай вёсачка. Раптам перад самалётам бліснула траса снарадаў, а над ім, заглушаючы рокат матора, з віскам пранёсся "месершміт".

– Праваароніў, расцяпа, – накінуўся сам на сябе Надтачэеў.

Ён ведаў, што нямецкія знішчальнікі, выходзячы на "свабоднае паляванне", не лічылі ганебным нападаць на адзіночныя аўтамашыны, павозкі, ганяліся нават за асобнымі пешаходамі. І, зразумела, сцярвятнік пастараецца не выпусціць жывой гэту безабаронную машыну. Так і ёсць. Развярнуўшыся, "месершміт" накіраваўся на У-2. Вытрымка, вытрымка патрэбна! Вось зараз... Надтачэеў рэзка адварочвае самалёт улева. Чарга прайшла міма. Яшчэ адзін, два, тры манеўры. Фашысцкі лётчык нервуецца. Дапускае промах за промахам.

Нарэшце, пікіруючы на У-2, не страляе. Увесь боезапас расходваў упустую. Што ж, і гэта перамога. Маленькая, але перамога. Снарады і кулі нямецкага знішчальніка маглі знайсці, і не беспаспяхова, іншую цэль.

Курская дуга… Гітлераўцы рыхтаваліся да летнягя наступлення 1943 года. Амаль ноч над імі віселі "русфанеры". Яны рвалі камунікацыі. Выводзілі са строю тэхніку і тысячы "доблесных" салдат і афіцэраў фюрэра. Камандаванне шалела, але не ведала, што прадпрыняць для адбіцця разбуральных налётаў.

Даводзілася не раз вылятаць на бамбёжку парэдняга краю гітлераўцаў і Георгію. Дакладна вывучыўшы абстаноўку і ўзгадніўшы свае дзеянні з дзеяннямі таварышаў, ён кожнае заданне выконваў рашуча і ўмела. Разведчыкам літаральна ў апошні момант удалося выявіць яшчэ адну агнявую кропку, якая размясцілася на стыку флангаў двух нашых батальёнаў.Гітлераўцы добра замаскіравалі яе і агню не вялі, рашыўшы, відаць, знянацку ўдарыць па салдатах, калі яны паднімуцца ў атаку. Георгій Мяфодзьевіч атрымаў заданне знішчыць кулямёт праціўніка. Цёмнай ноччу яго У-2 перасёк пярэдні край. З выключаным маторам, каб немцы не пачулі, Георгій павіс над агнявой кропкай і імгненна скінуў серыю бомб. Кулямёт і яго абслуга былі знішчаны. Больш у гэтым месцы нашым салдатам не пагражала небяспека.

…Надтачэеў паглядзеў на вышынямер. 1500 метраў. Добра. У-2 ляцеў над варожым тылам. Унізе – ні агеньчыка. Дзе ж склад гаручага? Што гэта святлее, рака? Сапраўды. Цяпер трэба знайсці круты выгіб. Крыху ўправа і… цэль. Самалёт страсануўся, вызваляючыся ад грузу. Секунды чакання здаліся вечнасцю. Дзве ўспышкі выбухаў ускалыхнулі неба вялізнае полымя. Яно шугала, афарбоўваючы лес у фантастычныя фарбы. Надтачэеў націснуў на сектар газа. Раптам быццам цяжкім каменем ударыла лётчыка па правай руцэ. У-2 хістануўся і, страціўшы кіраванне, рэзка пайшоў да зямлі. Толькі самых верхавін дрэў Георгій вывеў яго з беспарадкавага падзення.

Трэба дацягнуць. У што б там ні стала дацягнуць, – паўтараў Надтачэеў.

Звычайна лётчыкі-начнікі лінію фронта пералятаі на вялікай вышыні і з выключанымі маторамі. Гэтым яны блыталі ўсе карты дарожным зенітчыкам, якія стралялі на гук. Набраць патрэбную вышыню Надтачэеў не мог. Не дазвалялі сілы, якія мешалі з кожнай мінутай.

– Рызыкнём, га? – задаў сабе пытанне Георгій.

Ашаломленыя дзёрскасцю "русфанер" немцы ўзнялі страляніну толькі па гуку матора, які ўжо аддаляўся.

Гэта быў апошні, васьмідзесяты па ліку баявы вылет Надтачэева на У-2.

…Адыйшлі ў мінулае дні лячэння ў шпіталі. Засталіся ззаду курсы перападрыхтоўкі. У студзені 1944 года малодшы лейтэнант дэбютаваў у ролі лётчыка-штурмавіка 16-га гвардзейскага штурмавога авіяпалка. Лятаў на бамбёжку танкавых калон і чыгуначных станцый, граміў артылерыйскія батарэі, абараняўся сам і абараняў сваіх баявых сяброў ад атак нямецкіх знішчальнікаў.

31 студзеня 1944 года тры групы "ІЛАЎ" узняліся ў паветра. Ім трэба было нанесці бомбавы ўдар па буйному нямецкаму аэрадрому. Шэсць грозных машын, якія вёў старшы лейтэнант Філіпаў, абавязаны былі падавіць агонь зенітных сродкаў праціўніка. У гэту групу ўваходзіў штурмавік Надтачэева.

Як заўсёды, смеласць і хуткасць вырашылі поспех справы. Вось ужо знішчана каля 30 фашысцкіх самалётаў, выведзена са строю ўся сістэма супрацьпаветранай абароны аэрадрома. Час вяртацца дадому. Але што гэта здарылася з машынай лейтэнанта Протчава? Яна задымілася і імкліва панеслася да лініі фронту.

– Дацягне ці не дацягне? – свідравала мозг Надтачэева трывожнае пытанне. – Эх, не дацягнуў… Загінуць хлопцы…

Што ж рабіць? У памяці ўсплыў даўно бачаны кінафільм: савецкі лётчык-знішчальнік садзіцца да свайго таварыша і ўлятае з ім з-пад носа японскіх самураяў.

– Сокал! Дазвольце ісці на выручку, – папрасіў Надтачэеў дазволу ў вядучага.

– Пятнаццаты, пятнаццаты! Ці ведаеш ты, на якую рызыку ідзеш?

– Ведаю. Пастараюся…

– Дзейнічай!

"ІЛ" з пятнаццатым нумарам на фюзеляжы вываліўся са строю і пайшоў на зніжэнне. Да гарэўшага на зямлі самалёта беглі фашысцкія салдаты.

– Грыгор’еў! Папрацуй па наземных цэлях, – пракрычаў Надтачэеў.

Удар, яшчэ удар аб няроўнасці зямлі, і "ІЛ" падкаціў да гінучага самалёта.

– Хутчэй, хлопцы, хутчэй! – прыспешваў Надтачэеў сваіх баявых сяброў – лётчыка і стралка.

Праз некалькі мінут "ІЛ-2" з пятнаццатым нумарам на фюзеляжы прыстроіўся да штурмавікоў, якія трымалі курс на родны аэрадром. Усе машыны віталі яго лёгкім пагойдваннем крылаў.

Надтачэеву дзякавалі, яго абдымалі, цалавалі, віншавалі.

Гэта быў подзвіг, адзначаны ордэнам Леніна і Залатой Зоркай Героя.

**Ступень рызыкі // Маяк Прыдняпроўя (Быхаў). — 1974. — 12 лістапада. — С. 4.**